Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 2 (693) ● ПЯТНІЦА, 12 студзеня 1968 г. ● Цана 2 кап. Год выдання XXI

ЧЫТАЙЦЕ Ў СЁННЯШНІМ НУМАРЫ:

● РАЎНЕННЕ НА ВЫДАТНІКА ● КЛОПАТЫ КАМУНІСТАЎ ● ВУЧОБА І СПОРТ — ПОБАЧ ● ЧАМУ ЗАКРЫЛІ «ОКРАИНУ»?

## НА ЭКЗАМЕНАЦЫЙНАЙ ЛІНЕЙЦЫ

### ФІЗІКІ

**Аб студэнтах другой групы другога курса, якія спецыялізуюцца па радыёфізіцы і электроніцы, на фізфаку гавораць як аб старанных і сур'ёзных. Падрыхтоўку да экзаменаў яны ніколі не адкладваюць да сесіі. Адсюль і вынікі.**

**Вось экзамен па гісторыі КПСС. З трыццаці чалавек пяцёркі і чацвёркі атрымала дваццаць шэсць. Прычым, амаль палова групы здала на выдатна.**

**Глыбокія веды па праграмнаму матэрыялу паказалі Лугоўскі, Мачалаў, Паўловіч, Ляшчова і іншыя.**

### ФІЛОСАФЫ

*Пятнаццаць выдатных і добрых адзнак пастаўлена ў залікоўкі студэнтаў другога курса філасофскага аддзялення, якія днямі здавалі экзамен па логіцы. У групе— 27 чалавек. Але тры нездавальняючых не ў карысць філосафам, тым больш у пачатку сесіі.*

### ФІЛОЛАГІ

Першая група першага курса беларускага аддзялення здала экзамен па ўводзінах у літаратуразнаўства. Лепшыя адказы былі ў Толі Верабей, Светы Булат, Олі Беляновіч, Галі Нупрэйчык. Нажаль, слаба падрыхтаваліся Р. Драгун, Н. Васілёнак, а Л. Доўбня атрымала ўвогуле нездавальняюча.

### ХІМІКІ

**Чацвёрты курс трымаў экзамен па хіміі палімераў. Большасць студэнтаў паказала трывалыя веды. Аб гэтым сведчаць адзнакі — дзевяць выдатных, 27 добрых, дзевяць здавальняючых. І толькі двое атрымалі двойкі.**

**Паспяхова здала арганічны аналіз група арганікаў. Тут няма дрэнных адзнак. Дацэнт А. І. Чырко ацаніў на выдатна веды 12 студэнтаў групы.**

**А ў першакурснікаў справы куды горш. З трыццаці студэнтаў сёмай і восьмай груп, якія здавалі вышэйшую матэматыку дацэнту Р. Ф. Апацёнак, дзевяць атрымалі нездавальняюча і толькі чатыры — выдатна.**

# ХВАЛЯВАННІ СЕСІІ

РЭПАРТАЖ

Праходзячы па вучэбнаму корпусу, па ўсіх факультэтах, па чытальных залах і аўдыторыях, нельга не заўважыць адну характэрную асаблівасць — хваляванне. І гэта зразумела. Ідзе сесія. Кожны па-свойму перажывае гэты момант.

Вось стаяць дзве студэнткі. Адна ўзбуджана, радасцю свяцяцца яе вочы, але яна хавае гэтую радасць, бо што значыць яе шчасце, калі сяброўка здала экзамен горш.

Заканамернасць студэнцкага жыцця — тут побач ходзіць неапісальнае захапленне і панурасць. Хвалююцца ўсе: выкладчыкі і студэнты, лабаранты і аспіранты, дэканы і камсоргі.

Не былі абыякавымі, напэўна, і маладыя грэкі, якія расхаджвалі па брукаваных дворыках услед за філасофствуючымі Арыстоцелем і Платонам...

Яшчэ і сёння студэнты III курса факультэта журналістыкі поўны ўражанняў пасля здачы дзяржаўнага экзамена па замежнай мове. Лепшыя веды на гэтым экзамене дэманстравала група, выкладчыкам у якой была Валянціна Міхайлаўна Карачун.

— Сёння вы паказалі нядрэнныя веды, і я б вельмі хацеў, каб вы не кідалі гэтай справы, каб чыталі часцей газеты на замежнай мове. Вам, журналістам, ведаць замежную мову, я лічу, неабходна, — з такімі словамі звярнуўся да студэнтаў-журналістаў загадчык кафедры замежных моў Мікалай Міхайлавіч Полазаў. (здымак 1).

*(Працяг на 2-й стар.).*



1



2



3

# СВЯТА І БУДНІ ФАКУЛЬТЭТА

**Два дні ў біялагічным корпусе панавала радаснае ажыўленне. Яно запаўняла вестыбюль і калідоры, калі адчыняліся дзверы восьмай аўдыторыі, якую былыя выпускнікі ўніверсітэта зналі як чытальную залу. Цяпер тут адбываецца сустрэча калег. З далёкіх і блізкіх куткоў Беларусі сабраліся ў родным універсітэце выпускнікі біяфака розных гадоў. Сярод іх прадстаўнік першага выпуску, 1925 года, дацэнт Мінскага інстытута фізкультуры І. Е. Яхнавецкая, заслужаныя настаўнікі М. К. Беразоўскі, А. А. Гуцько з Магілёва, І. Н. Булойчык, А. Р. Адзінец, Н. К. Залужная з Клецка, Н. Д. Станкевіч са Шчучына, узнагароджаная ордэнам Леніна, супрацоўнік АН БССР прафесар І. М. Сержанін і многа-многа іншых.**

**— Такой сустрэчы ў нас не было з 1963 года, —расказвае Аліна Васільеўна Лёшына, адна з удзельніц і арганізатараў склікання выпускнікоў. — Рыхтаваліся мы да яе загадзя. Адшукалі адрасы выхаванцаў універсітэта, вызначылі праграму, разаслалі запрашальныя білеты, далі аб'явы ў газетах і пачалі чакаць. Адгукнуліся многія.**

**У першы дзень дарагія госці факультэта пабывалі на кафедрах, а вечарам сабраліся ў вялікай аўдыторыі, дзе іх вітаў лаўрэат Ціміразеўскай прэміі акадэмік АН БССР прафесар Т. М. Годнеў. Дэкан факультэта дацэнт П. Р. Пятровіч расказаў, з якімі паказчыкамі сустрэў калектыў факультэта 50-годдзе Вялікага Кастрычніка. Акадэмік АН БССР прафесар П. Ф. Ракіцкі пазнаёміў прысутных з асноўнымі этапамі развіцця генетыкі ў СССР за гады Савецкай улады.**

**На наступны дзень прадстаўнікі розных пакаленняў біёлагаў з цікавасцю слухалі прафесара Л. С. Чэркасаву, члена-карэспандэнта АН СССР А. А. Шлыка, доктара медыцынскіх навук Ю. К. Фамічова, якія расказалі аб праблемах, поспехах, перспектывах біяхіміі, біяфізікі, генетыкі мікраарганізмаў.**

**А вечарам выпускнікі сабраліся на сяброўскую вячэру.**

***

**У той час, калі вопытныя ўжо спецыялісты-біёлагі святкавалі сустрэчу, тыя, хто толькі прылучыўся да біялогіі, здавалі свой першы экзамен — анатомію раслін.**

**Паверхам вышэй, у 25 аўдыторыі біякорпуса, першакурснікаў экзаменаваў загадчык кафедры фізіялогіі і біяхіміі раслін дацэнт С. У. Калішэвіч.**

**Першыя адказы — першыя выдатныя адзнакі.**

**Паспяхова пачалі свой студэнцкі шлях А. Емяльянчык, Т. Краўчанка, Т. Гарбачова, Н. Каханоўская, А. Шырнюк, Г. Сідарава, Р. Чарнабаева і многія іншыя з трэцяй і шостай груп.**

**Вось за стол выкладчыка садзіцца Н. Шавель. Яна падрабязна адказвае на пытанні білета. Сяргей Уладзіміравіч кладзе на стол кусок драўніны і просіць паказаць усе ткані, расказаць аб ствале дрэва.**

**— Калі лепш секчы дрэва? — пытае выкладчык, а затым ідзе грунтоўны адказ студэнткі.**

**Добра адказала Н. Шавель і на астатнія пытанні, правільна вызначыла прэпарат пад мікраскопам. І ў залікоўцы з'явілася першая выдатная адзнака.**

**— Вынікі экзаменаў у гэтых дзвюх групах можна лічыць нядрэннымі, — гаворыць Сяргей Уладзіміравіч. — Мяркуйце самі: у трэцяй групе восем выдатных, 12 добрых і шэсць здавальняючых адзнак і толькі адна нездавальняючая. У шостай — 10 выдатных і 10 добрых, чатыры здавальняючыя і дзве нездавальняючыя.**

**Вядома, у першакурснікаў было нямала цяжкасцей, яны ж толькі пачалі пасцігаць тайны навукі.**

**А. АЛЕНІЧ.**

***

Экзаменацыйная сесія на IV курсе біяфака толькі пачалася. Здадзен першы экзамен. Для некаторых ён прынёс засмучэнні, для большасці — прайшоў паспяхова. Мне хочацца расказаць аб некаторых камсамольцах нашага курса.

Вось, напрыклад, Зіна Глушкевіч. Яна заўсёды старанна рыхтавалася да экзаменаў, на працягу семестра наведвала ўсе лекцыі і практычныя заняткі. Троек у яе ўвогуле не было. І аднак перад экзаменам па педагогіцы заўважальна хвалявалася. Але ўвесь страх прайшоў, калі Зіна ўзяла білет. Як заўсёды, ён быў шчаслівым! Іна Іванаўна Рыданава задаволена адказам. У заліковай кніжцы Зіны з'явілася чарговая пяцёрка.

Не адстала і Аня Дудзейка. На малодшых курсах у яе не зусім гладкай была вучоба: часта пападаліся тройкі. Але ўжо на трэцім курсе тройкі амаль зніклі, а чацвёрты курс Аня вырашыла пачаць з пяцёркі. Што ж, гэта вялікі поспех, і Аня яго заслужыла.

На выдатна здалі экзамены Тамара Алёкса, Ніна Уласава, Люба Абэцэдарская і іншыя.

Некаторыя лічаць, што грамадская работа забірае шмат часу, перашкаджае паспяхова займацца. Алег Белянкевіч у гэта не верыць. Ён у нас на курсе чалавек заняты. Алег — член камсамольскага бюро факультэта, многа ўвагі ўдзяляе гэтай рабоце. Але яшчэ сур'ёзней яго адносіны да вучобы. Свой чарговы экзамен Алег таксама здаў на выдатна.

Бывае, што першы поспех прыносіць заспакаенне, бестурботнасць, некаторыя перастаюць па-сапраўднаму рыхтавацца. Пра нашых камсамольцаў гэтага сказаць нельга. Яны поўны жаданняў вытрымаць паспяхова і астатнія экзамены. Думаем, што так і будзе.

*Е. ДАВЫДЗЮК,*
*камсорг IV курса біяфака.*

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

# КАНКРЭТНА — ЗНАЧЫЦЬ ГЛЫБОКА

На агульным справаздачна-выбарчым сходзе фізічнага факультэта камуністы зрабілі многа крытычных заўваг у адрас былога бюро, а таксама выказалі цэлы шэраг прапаноў, накіраваных на паляпшэнне ўсёй партыйна-палітычнай работы на факультэце. Сакратаром партыйнага бюро быў абраны малады энергічны камуніст П. Л. Салаў.

Не адзін вечар правёў Пётр Лаўрэнцевіч над роздумам, як наладзіць партыйную работу на факультэце, з чаго пачаць? Узважваў кожную прапанову камуністаў, раіўся з членамі партыйнага бюро. І нараджаліся добрыя планы, за ажыццяўленне якіх узялося партыйнае бюро. Перш за ўсё вырашалася праблема кадраў. На рашаючыя ўчасткі грамадскай работы былі накіраваны працавітыя і аўтарытэтныя актывісты: Ігар Шынгель стаў сакратаром камсамольскага бюро факультэта, прафсаюзныя бюро студэнтаў і выкладчыкаў узначалілі Пётр Старасцін і Казімір Сабіла. Ужо гэта прыкметна ажывіла грамадскую работу на факультэце. У падрыхтоўку да 50-годдзя Кастрычніка былі прыцягнуты ўсе камсамольцы, шматлікі атрад членаў прафсаюза. На камсамольскіх сходах сталі глыбока і прынцыпова вырашацца разнастайныя пытанні жыцця і вучобы студэнтаў. Змянілася аблічча факультэта. Тут з'явілася з густам аформленая дошка лепшых людзей факультэта.

Выбралі новыя студсаветы, за інтэрнатамі замацавалі аўтарытэтных, з вялікім жыццёвым вопытам камуністаў, такіх, як У. В. Цакуноў, А. В. Шыбаева, Э. М. Шпілеўскі. Яны разгарнулі цікавую работу ў інтэрнатах, сталі дарадчыкамі і старшымі сябрамі студэнтаў.

На факультэце створан карэспандэнцкі пункт газеты «Беларускі універсітэт», які ўжо прыступіў да работы. Дзейнічаюць тры калектывы мастацкай самадзейнасці: два танцавальных і адзін эстрадны. Як бачна, адзін толькі пералік зробленага гаворыць аб тым, што новае партыйнае бюро, узначальваемае энергічным камуністам П. Л. Салавым, нямала зрабіла за кароткі час, ажыццявіла шэраг карысных прапаноў.

Дзейнасць партыйнага бюро носіць дзелавы, канкрэтны характар. Канкрэтнасць гэтая праяўляецца ў глыбокім пранікненні ў сутнасць пытання і ў адшуканні такіх рычагоў, з дапамогай якіх можна пераадолець цяжкасці і пайсці ўперад. Іменна гэтую канкрэтнасць і хочацца праілюстраваць на адным прыкладзе.

Рыхтуючыся да зімовай сесіі, партыйнае бюро вынесла рашэнне арганізаваць глыбокую праверку самастойнай работы студэнтаў пасля дзённых заняткаў. Пачалі з першага курса. У партыйнае бюро факультэта былі запрошаны выкладчыкі і куратары, якія працуюць з навічкамі. Дэталёва абмеркавалі ўсе пытанні, звязаныя з прадстаячай сесіяй, намецілі канкрэтныя меры па падрыхтоўцы да яе.

Для праверкі работы другога і трэцяга курсаў ужылі іншы метад. Стварылі спецыяльныя камісіі, якім даручылі зрабіць рэйды ў інтэрнаты па праверцы самастойнай работы студэнтаў над вучэбным матэрыялам. Камісіі сабралі багаты матэрыял. Яны ўстанавілі, што тыя студэнты, якія штодзённа працуюць па 4—5 гадзін пасля лекцый вучацца на «выдатна» або «добра». Побач з гэтым было выяўлена многа студэнтаў, якія не маюць ніякага распарадку дня і шмат часу праводзяць у горадзе за рознымі забавамі. У выніку — слабыя веды, правалы на практычных занятках, а затым і на сесіі. Пасля таго, як быў сабраны дэталёвы матэрыял, партыйнае бюро прыняла рашэнне правесці адкрыты партыйны сход з павесткай дня «Аб самастойнай рабоце студэнтаў другога і трэцяга курсаў над вучэбным матэрыялам у час семестра». Такі сход быў праведзены 11 снежня. Прайшоў ён як ніколі актыўна. Акрамя дакладчыкаў, сакратароў камсамольскіх бюро курсаў Эдуарда Доўнара і Вячыслава Махцюка, на ім выступіла 9 чалавек. Выступленні былі дзелавыя, адчувалася агульная зацікаўленасць і клопат. Прынятае рашэнне з першага да апошняга слова канкрэтнае, дзелавое.

Але на правядзенні адкрытага сходу партыйнае бюро не паставіла кропку. Яго вынікі абмеркаваны ў кожнай вучэбнай групе. Добра падрыхтаваны і праведзены партыйны сход, давядзенне яго вынікаў да кожнага студэнта — далі свае станоўчыя вынікі. Факультэт сустрэў сесію, як ніколі падрыхтаваным.

За кароткі час тут многае зроблена па ажыўленню партыйнай работы, па ўзняццю ролі партыйнай арганізацыі ў жыцці фізічнага факультэта.

Ул. КУЛАЖАНКА.

# ХВАЛЯВАННІ СЕСІІ

РЭПАРТАЖ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).*

Адны заканчваюць курс той ці іншай навукі, а другія толькі пачынаюць.

— Першая сесія. Ад яе многае залежыць, — так лічыць студэнтка першага курса фізфака Ніна Цвікевіч і таму лішні раз зазірнуць у канспект не пашкодзіць. (Здымак 3). Толькі від фотаапарата прымушае яе адарвацца на хвілінку ад сваёй справы.

Р. А. Малюковіч задаволены адказам студэнткі другога курса матэматычнага факультэта Валянціны Шабека (здымак 2).

— Уласна кажучы, я гэтага і чакаў, бо Валя Шабека заўсёды старанна рыхтавалася да практычных заняткаў, — сказаў Раман Аляксандравіч, ставячы ў залікоўку «выдатна». Тут жа за дзвярыма пытаюся ў дзяўчыны (прозвішча адмовілася назваць), што цяжэй здаваць: матэматычны аналіз ці гісторыю КПСС?

— Зразумела, гісторыю! — адказвае яна.

Так, нам таксама зразумелы яе адказ, тым больш, што зараз патрабаванні да вывучэння грамадскіх навук значна павялічыліся.

Лічыцца: добра тое, што добра канчаецца. Але для студэнткі першага курса юрыдычнага факультэта Алы Савіцкай добрая адзнака, якую ёй паставіў загадчык кафедры тэорыі дзяржавы і права В. А. Дарогін, азначае ўдалы пачатак і, бадай, не горшае яго заканчэнне. (Здымак 4).

Паўзе ўказка па карце, паказваючы мацярыкі, паўвостравы, азёры, рэкі. Гэта здае залік па геамарфалогіі Валя Касмянчук, студэнтка другога курса геолага-геаграфічнага факультэта. Пройдзе некаторы час і, хто ведае, можа, па гэтых месцах, дзе зараз гуляе ўказка, прыдзецца пракладваць новыя шляхі... Ну, гэта, вядома, праз час, а цяпер сесія... (Здымак 6).

Нямала клопатаў прынесла сесія і вячэрнікам. Усюды трэба паспяваць: і ў працы, і ў вучобе. Дацэнт кафедры неарганічнай хіміі Г. І. Васільева правярае рашэнне задачы ў студэнткі другога курса хімфака Святланы Гарбуновай. (Здымак 5).

Няўмольна бяжыць час, аддаляючы з кожнай гадзінай адзін год ад другога, сесію ад сесіі. Раз'едуцца ў розныя бакі сённяшнія студэнты: адзін паедзе працаваць настаўнікам, другі будзе вандраваць з геалагічнай экспедыцыяй, трэці засядзе ў рэдакцыі газеты, але ў кожнага ў памяці застанецца звычайная студэнцкая сесія з яе хваляваннямі, няўдачамі і поспехамі.

А. ПАЎЛЯНКОЎ,
студэнт журфака.







# ...І ЗНОЎ — ВУЧОБА

З інтэрната мы выйшлі рана. Па вуліцах Мінска яшчэ толькі пачаў соўгацца гарадскі транспарт: тралейбусы, аўтобусы, трамваі, таксі.

Рабочы дзень пачынаўся і таму на прыпынках было мнагалюдна.

У нас экзамен, першы ў гэтую сесію. Мы — я, Янка Чыгір, Толя Зянько, Валодзя Свяржынскі — ідзем па вуліцы горада. Лёгка ўдыхаецца халоднае паветра, а на душы гарачы неспакой і хваляванне.

— Страшнавата, — першым выказвае нашу агульную думку Валодзя Свяржынскі.

— Ды кіньце вы... — я хачу паказаць сябрам сваю абыякавасць.

— Пасля трох год першы экзамен. Гэта міжволі выклікае хваляванне.

І я ківаю галавой у знак згоды. Далей мы ідзем моўчкі.

У паветры кружаць сняжынкі. Я гляджу на хлопцаў. Першы экзамен за тры гады. Не! Зусім не першы. Жыццё — гэта барацьба за дасягненне мэты. Экзамены — гэта таксама барацьба за мэту.

Хлопцы былі прызваны ў рады Савецкай Арміі з другога курса філалагічнага факультэта.

Валодзя Свяржынскі і Янка Чыгір служылі у Беларусі, Толя Зянько — у Прыбалтыцы. З першых дзён службы яны зарэкамендавалі сябе не толькі выдатнікамі баявой і палітычнай падрыхтоўкі, але і добрымі арганізатарамі, актывістамі сярод воінаў. У вольны час яны арганізоўвалі літаратурныя вечары, дыспуты. Скажам, Янка Чыгір і Толя Зянько ўзначальвалі камсамольскую работу ўзводаў. Валодзя Свяржынскі быў няштатным карэспандэнтам акруговай ваеннай газеты, рэдагаваў сваю, насценную. Самым лепшым сябрам у вольны час для хлопцаў былі кнігі, асабліва мастацкая літаратура, яе навінкі.

Трымалі хлопцы сувязь і з таварышамі-студэнтамі, праз якіх даведваліся аб жыцці свайго універсітэта.

І вось гады службы закончаны. Ян Чыгір, Анатоль Зянько і Уладзімір Свяржынскі — зноў студэнты.

Першыя агульныя лекцыі. Пасля — практычныя заняткі. Вучоба адразу давалася нялёгка: многае было забыта. На дапамогу прыходзяць студэнты-аднакурснікі Юра Нагорны, Толя Бруцкі, Віктар Ярац, выкладчыкі Я. М. Камароўскі, І. К. Германовіч і іншыя.

Працаваць прыходзілася многа. Днямі хлопцы праседжвалі у бібліятэках, у вучэбных кабінетах універсітэта. Паступова надышла і сесія. Своечасова здалі залікі. Наперадзе — экзамены...

Мы выходзім з гуманітарнага корпуса універсітэта.

— Ну, вось бачыш, а ты хваляваўся, — кажу я Валодзю Свяржынскаму.

— Здаць на «добра» — гэта добра, — усміхаецца Янка Чыгір.

— А на «выдатна» — гэта выдатна, — дапаўняе свайго сябра Толя Зянько.

— Другі экзамен будзе на выдатна! — цвёрда запэўнівае ўсіх Валодзя Свяржынскі...

Мы ідзем моўчкі. Пачаўся студзеньскі дзень, гарачы дзень сесіі.

С. БАЛОТКІН,
студэнт II курса
філфака.



*У зімовым убранні.*

# КЛІЧУЦЬ ДАРОГІ

Даўно ўжо за вокнамі перагукваецца завеямі лютая зіма. Пазанесены гурбамі снегу дарогі, сцяжынкі, па якіх некалі хадзілі ў паходы, цікавыя экспедыцыі. Можна толькі ўспамінаць зараз пра тыя дзіўныя гадзіны.

Але зноў і зноў цягне ў далёкія шляхі імклівых турыстаў. Нават зараз, у час сесіі, ва ўсіх кутках турклуба спрачаюцца, удакладняюць маршруты. Адны хочуць хоць зараз адправіцца на Сіняверскую Паляну, другія яшчэ толькі вывучаюць карту з выразнымі контурамі вядомага возера Селігер. Туды, на Валдай, да вытокаў вялікай Волгі збіраюцца весці свае групы Аляксандр Васіленка і Вера Варачаева (III курс фізфака).

— Жадаючых адправіцца ў паходы на час зімовых канікул многа. У бюро гарадскога турклуба ўжо ёсць 150 заяў толькі ад студэнтаў нашага універсітэта, але ці пойдуць усе ў паход — гэта цяжка сказаць. Чаму? Вядома, летам—гэта справа іншая, а вось зараз, калі, як кажуць, птушка ў паветры замярзае, многія «энтузіясты» не адважацца пайсці па заснежаных палях і лясах, — гаворыць Барыс Раманаў (II курс фізфака), група якога пойдзе пасля сесіі па маршруту Маладзечна—Вільнюс. Паралельна гэтай групе накіруецца група Барыса Мардухозіча (II курс матфака). Групы сустрэнуцца праз чатыры дні ў Ашмянах, каб разам ісці да самага Вільнюса.

...Вывяраюць і ўдакладняюць маршруты студэнты-турысты, а за вокнамі трашчыць мароз. Мала, відаць, каму хочацца ў такія гадзіны пахадзіць па шырокіх снежных прасторах краіны. Толькі няўрымслівым студэнтам не сядзіцца дома. Клічуць іх далёкія і блізкія дарогі.

**А. ЛЮБЛЯНАЎ.**

## *Працягваючы традыцыю*

Як узнікла, як нараджалася гэтая традыцыя, цяпер сказаць нялёгка. Можа, гэта не так і важна. Важна іншае, што яна жыве, становіцца часцінкай студэнцкага жыцця. А традыцыя гэта заключаецца ў правядзенні вечароў пытанняў і адказаў у інтэрнаце па вуліцы Свярдлова, дзе жывуць студэнты хімічнага і геаграфічнага факультэтаў.

У мінулым навучальным годзе тут былі праведзены два такія вечары, у якіх прымалі ўдзел выкладчыкі кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі і навуковага камунізма.

Нядаўна адбыўся чарговы вечар пытанняў і адказаў. У госці да студэнтаў прыйшлі загадчык кафедры навуковага камунізма дацэнт М. Р. Круцько, кандыдат філасофскіх навук дацэнт А. Д. Гусеў, кандыдат эканамічных навук У. А. Кулажанка, выкладчык кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі І. І. Шаціла, а таксама аўтар гэтых радкоў.

Удзельнікам вечара неабходна было высветліць цэлы шэраг пытанняў, што закранаюць многія бакі міжнароднага жыцця. На самай справе, аб тым, наколькі шырокае кола інтарэсаў студэнтаў, сведчыць колькасць паступіўшых пытанняў — больш дваццаці. Тут былі пытанні аб падзеях у Грэцыі і дэвальвацыі фунта стэрлінгаў, аб культурных пераўтварэннях у Сірыі і аб шляхах развіцця маладых афрыканскіх дзяржаў і г. д. На гэтыя і іншыя пытанні былі даны змястоўныя адказы.

У заключэнне выступіў кандыдат філасофскіх навук дацэнт А. Д. Гусеў, які ў складзе дэлегацыі нашай рэспублікі прымаў удзел у рабоце XXII сесіі Генеральнай Асамблеі ААН. Яго расказ выклікаў вялікую цікавасць.

Так, традыцыя жыве. У гэтым заслуга саміх студэнтаў, якім прышліся да спадобы такія гутаркі, і, несумненна, выкладчыкаў, што здолелі ўзбудзіць цікавасць да гэтых гутарак.

**Ю. ГУСЕЎ,**
кандыдат філасофскіх навук.

# «УНІВЕРСІТЭТ У МІНСКУ? МАЎЧАЦЬ!»

*Старонкі гісторыі*

Цікавая і поўная трагічных фактаў гісторыя барацьбы беларускага народа за сваю нацыянальную культуру да Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. Вось адна з яе старонак.

Пасля паражэння рэвалюцыі 1905—1907 гг. у Расіі наступіў перыяд рэакцыі. Але царызм не мог задушыць імкненне народа да свабоды і прагрэсу. Іменна ў гэты час на старонках выдаваемай у Мінску газеты «Окраина» прагучаў зноў смелы голас беларусаў, якія захацелі «людзьмі звацца». Газета надрукавала артыкул «На лету», у якім у вострай іранічнай форме гаворыцца аб праекце стварэння універсітэта ў Мінску. Артыкул пабудаваны ў форме звароту Кашчэя Бессмяротнага да жыхароў горада. Коратка і ясна раскрываецца палітыка самадзяржаўя — душыцеля ўсяго светлага і здаровага.

Мясцовыя ўлады зразумелі алегарычны сэнс выступлення газеты. Рэдактара аштрафавалі на вялікую суму, а газету канфіскавалі. Але некаторыя нумары паспелі ўжо разысціся па руках. Адзін з іх захоўваецца цяпер у Цэнтральным дзяржаўным гістарычным архіве Беларусі. Нядаўна старшы навуковы супрацоўнік архіва Т. Вараб'ёва расказала на старонках «Вячэрняга Мінска» аб гэтай гісторыі.

Дык паслухайце Кашчэя Бессмяротнага:

**«Наіўныя людзі — члены таварыства сельскай гаспадаркі. І прытым забыўлівыя. Яны забыліся, што ў нашым парламенце кажуць — дзякуй богу, што ў нас няма парламента! І з ім — свабод. Асветы. І наогул усялякай крамолы. І вось забыўшыся на акалічнасць гэту, на якую, дарэчы, рускім абывацелям забывацца нельга, нашы сельскія гаспадары ўзнялі пытанне аб вышэйшай навучальнай установе ў нашым горадзе.**

**Доўга яны гаварылі па гэтаму пытанню. Шмат нагаварылі добрых рэчаў, абдумалі пытанне вельмі глыбока, разабралі яго ўсебакова і ўсё-такі — наіўныя! — засталіся ў перакананні, што універсітэт з тэхнічнымі аддзяленнямі ў нашым краі неабходны. І ніхто, ніхто не абязброіў, ніхто не ўказаў ім іх памылкі! А іх памылка заключаецца ў тым, што яны забыліся, які пры адсутнасці парламента можа быць у нас універсітэт — і з якімі аддзяленнямі.**

**Юрысты, урачы, тэхнікі. Каму яны патрэбны! Юрыст абавязкова кадэт. Урач абавязкова сацыяліст, бо лечыць кожнага, і няма ў яго, акаяннага, разумення, што нельга лячыць крамольнікаў. А ўсе тэхнікі — асабліва хімікі — бамбісты абавязкова. А гэтыя крамольныя сельскія гаспадары іменна і хочуць: юрыстаў, урачоў і тэхнікаў. Хочуць якраз таго, чаго не патрэбна.**

**Нам патрэбны «рускія абывацелі», моцныя ў праваслаўі. У кулаку. У даносах. Бо такіх дзеячоў можа стварыць толькі сапраўды рускі універсітэт, і каб яго адкрыць, трэба абкласці яўрэяў і палякаў Мінскай губерніі аднаразовым зборам у 3 мільёны рублёў, 2 мільёны ўкрасці на сваю карысць, а на трэці заснаваць сапраўды рускую ўстанову. Вышэйшую ўстанову! І адкрыць там некалькі кафедраў: Дэманалогіі, Міхаіла Архангела, Св. Вольгі, Слепатрапання, Паліцэйскага права, Даносаў. У прафесарах недахопу быць не можа. Зусім дарэмна пачалі хваліцца сельскія гаспадары, што Мінскі універсітэт, калі ён створыцца, не будзе мець і навуковых сіл! Яны думалі пра вучоных. Але ж гэта забабоны! Час скончыць гэта перайманне дрэнных звычак у дрэннай Еўропе. Трэба ствараць сваё, самабытнае. Прафесар-вучоны — гэта Еўропа. А прафесар-акалотачны — гэта Расія. Мог жа ў пачатку XIX стагоддзя чытаць ва універсітэце лекцыі па філасофіі акалотачны! Гэта самабытнасць! Будзем жа самабытныя!**

**Так, кафедру дэманалогіі можа заняць калі не сам архімандрыт Мікалай, былы рэктар семінарыі, які дэманстраваў д'ябла з дапамогай чарадзейнага ліхтара, дык хто-небудзь з выкладчыкаў семінарыі, што засвоіў яго сістэму і метады даследавання д'яблаў.**

**Кафедра Міхаіла Архангела, канешне, можа быць занята толькі славутым Пурышкевічам пры адной толькі ўмове, каб перад кожнай лекцыяй ён не бачыў і нават не думаў пра Мілюкова, а то будзе лаяцца.**

**Кафедра Св. Вольгі належыць, зразумела, М. О. Меньшыкаву — ён будзе вучыць, як па метаду Вольгі паліць палякаў у лазні, тапіць іх у рацэ і г. д.**

**Лекцыі па слепатрапанні будуць, вядома, чытаць выкладчыкі мінскага вучылішча сляпых. Лекцыі будуць ілюстравацца доследамі над злоўленымі «Минским словом» крамольнікамі.**

**Паліцэйскае права ў Мінскім універсітэце будзе, зразумела, чытаць вядомы Ів. Чыгіраў, знаёмы з гэтай навукай не толькі тэарэтычна, але і па вопыту.**

**І, нарэшце, кафедру даносаў зоймуць супрацоўнікі «Минского слова». Такі універсітэт, па нашаму часу, надзвычай гуманны і прагрэсіўны, можа быць адкрыты ў Мінску зараз жа, як толькі з яўрэяў і палякаў будуць сабраны 3 мільёны і 2 — украдзены.**

**Калі ж паны сельскія гаспадары хочуць іншага універсітэта, дык хай узброяцца саратаўскай цярплівасцю і чакаюць да таго часу, пакуль рак свісне. А ён свісне тады, калі міністры скажуць: «У нас ёсць парламент».**

**Кашчэй».**





*На здымку ўверсе: выкладчык А. М. Аранскі тлумачыць рашэнне задачы студэнтам 4-га курса фізічнага факультэта.*

*Старанна рыхтуюцца да экзаменацыйнай сесіі нашы в'етнамскія сябры — студэнты падрыхтоўчага факультэта (здымак унізе).*

*Фота І. АСКІРКІ.*

